**Лінгвістычнае спаборніцтва “Фарбы слова”**
**Мэта:** абагульненне і сістэматызацыя ведаў, набытых падчас урокаў беларускай мовы і літаратуры.
**Задачы**: садзейнічаць узбагачэнню слоўнікавага запасу школьнікаў; развіваць у вучняў кемлівасць, пачуццё слова; фарміраваць уменне творчага прымянення ведаў; выхоўваць цікавасць да мовы, культуры маўлення.
**Абсталяванне:** карткі з заданнямі, сігнальныя карткі, прэзентацыя.

У мерапрыемстве прымаюць удзел 2 каманды.

## Ход мерапрыемства

**Вядучы:**

- Добры дзень!

Я рада сёння вітаць усіх знаўцаў роднай мовы.

*Вучаніца чытае верш*

Вы паслухайце родную мову:
Жаўруковаю песняй звініць…
Колькі фарбаў, адценняў у слове!
Як пявуча ліецца-гучыць!

Васількамі, рамонкамі шэпча
У квяцістых, раздольных лугах.
Гулкім рэхам гамоніць у зарэччы,
Салаўінаю трэллю ў гаях.

То шчымліва, журботна галосіць,
То вясёлкай над борам плыве.
Так у госці ласкава запросіць,
Так бяседу гасцінна вядзе!

Хай іскрыцца пад сонцам вясенням,
Спелым коласам нівы шуміць!
У карагодзе кружыць вясельным
Веру, мова мая – будзе жыць!

- Гэтымі цудоўнымі радкамі пра родную мову беларускай паэткі Лідзіі Полазавай мы пачынаем наша мерапрыемства.

- Веру, што ўдзел у нашым моўным спаборніцтве прымаюць тыя, хто шануе, любіць і ведае родную мову.
- Давайце знаёміцца.

**Прадстаўленне каманд.**
- Сустракайце каманду “**СЛОВА**” і яе капітана …
- Другая каманда “**СКАЗ**” і яе капітан …

**Узаемапрывітанне каманд.**
***Каманда “Слова”***

Дзень добры, моцны наш сапернік,
Да перамогі шлях цяжкі!
Хай дапаможа нам вязенне,
А вам – уласныя мазгі!

***Каманда “Сказ”***

Не паражэнне, а перамогу ў гэты раз
Жадаем мы вам у адказ.
Хай весялосць і розум дапамогуць вам,
Нашым дасціпным, вынаходлівым сябрам!

- А я  жадаю поспеху і камандзе “Слова”, і камандзе “Сказ”.
- Ітак, мы пачынаем.

**<u>Першае выпрабаванне “Ветлівасць”</u>**
- Паважаныя гульцы,  ваша задача ўставіць патрэбныя па сэнсе словы ў верш Васіля Віткі.

За кожнае правільна ўстаўленае слова вы атрымаеце 1 бал.

Добра, калі ты змалку
Можаш вітаць людзей
Раніцай: “**________________________” (Добрага ранку)**
І апоўдні: “________________________”, **(Добры дзень!)**
Увечары пры сустрэчы
Знаёмым сказаць: “___________________________”, **(Добры вечар!)**
А соннаму сонейку нанач
І ўсім добрым людзям: “**_______________________”. (Дабранач!)**

**Малайцы. Вы справіліся з першым заданнем. Памятайце, што**
Ад слова вырастаюць крылы,
А ў сэрцы стукае любоў,
Ад слова прыбываюць сілы,
Дык не шкадуйце шчырых слоў!

**<u>Другое выпрабаванне</u>**

-Мы з вамі ўспомнілі словы прывітання на беларускай мове, а зараз увага на экран. Назавіце, каго ці што вы бачыце на малюнку. Бал атрымае тая каманда, якая хутчэй пакажа сігнальную картку, якая будзе сведчыць, што каманда гатова адказаць. А самае галоўнае: правільны адказ.

1. Сланечнік
2. Бурак
3. Певень
4. Парасон
5. Вясёлка
6. Конік
7. Агрэст
8. Кавун
9. Дзьмухавец
10. Люстэрка

**Трэцяе выпрабаванне** ***"Назаві адным словам"***

- Даць агульную назву прапанаваным словам. За правільны адказ — 1 бал.

Пчала, жук, чмель (насякомыя).

Чаравікі, боты, туфлі (абутак).

Званочак, рамонак, васілёк (кветкі).

Верабей, ластаўка, сарока (птушкі).

Сукенка, спадніца, футра (адзенне).

Заяц, воўк, мядзведзь (звяры).

**Чацвёртае выпрабаванне “Цікава ведаць”**

Ваша задача - назваць лексічнае значэнне наступных слоў.

Першыя словы камандзе “Сказ”:

***Брыль-***

**1. Казырок шапкі, капялюш(з палямі)**

2.Плітка, цаглінка з якога-небудзь спрасаванага матэрыялу.

3.Лінія, па якой праходзіць край абочыны, кувета на дарогах.

***Небарака-***

1. Лёгкае драўлянае збудаванне для часовага жылля.

**2. Няшчасны чалавек, які выклікае спагаду, спачуванне.**

3. Сельскагаспадарчая землеапрацоўчая прылада ў выглядзе рамы з вертыкальнымі зубамі для рыхлення глебы.

***А цяпер будзе адказваць каманда “Слова”***

***Бруд-***

1. Зялёная паверхня з водарасцей, якой пакрываецца застаялая вада.

2.Праезджая частка плошчы, вымашчаная каменнем.

**3. Гразь,  смецце, нечыстоты,а таксама што-небудзь нізкае , амаральнае.**

***Гарлач-***

1.Вадзяная лілея.

2. Той, хто гарлапаніць; крыкун.

**3.Гліняны гладыш з вузкім горлам для малака.**

**<u>Пятае выпрабаванне </u>“Конкурс кемлівых”**

Аднавіце словы, у якіх згубіліся першыя склады.

| | |
|---|---|
| …роз | …рова |
| …нок | …рога |
| …рох | …рока |
| …рог | …рона |
| .. лата | .. зета |

**Адказ:** мароз, вянок, гарох,  парог (пірог), золата, карова, дарога, сарока, варона (карона), газета.

**Хвілінка адпачынку** (вучні спяваюць песню)

**<u>Шостае выпрабаванне </u> “Эрудыт”**

Імёны бываюць поўныя і скарочаныя, напрыклад: Галіна – Галя, Леанід – Лёня. Назавіце поўныя адпаведнікі да скарочаных імён.

1. Алёша (Аляксей), Федзя (Фёдар), Нюра (Ганна), Жэня (Яўген).
2. Вася (Васіль), Косця (Канстанцін), Маня (Марыя), Коля (Мікалай).

**Конкурс капітанаў “Веру – не веру”**

1. Усіх часцін мовы 10. *(Веру)*
2. Слова “дзве” пішацца з мяккім знакам. *(Не веру)*
3. Галосных гукаў 6. *(Не веру)*
4. Дапаўненне адказвае на пытанні ўскосных склонаў. *(Веру)*
5. Марфалогія – гэта раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца словы як часціны мовы. *(Веру)*
6. Прыназоўнік, злучнік, часціца – самастойныя часціны мовы. *(Не веру)*
7. Назоўнікі “радасць”, “задавальненне” – абстрактныя. *(Веру)*

1. У прыметніках множнага ліку вызначаецца род. *(Не веру)*
2. Акалічнасць адказвае на пытанні як? дзе? куды? *(Веру)*
3. Фанетыка вывучае гукі, а арфаграфія – правапіс слоў. *(Веру)*
4. Боль, надпіс, палын, медаль – назоўнікі жаночага роду. *(Не веру)*
5. Гук р звонкі. *(Веру)*
6. Канчатак – гэта зменная частка слова. *(Веру)*
7. Адпаведнікам да рускага назоўніка “клюква” з’яўляецца слова “ажыны”. *(Не веру)*

**<u>Сёмае выпрабаванне “Перакладчыкі”</u>**

Вам патрэбна перакласці з рускай мовы на беларускую наступныя словы.
(карткі са словамі раздаюцца камандам)
Лицо – твар
Шкаф - шафа
Неделя - тыдзень
Черника - чарніцы
Сережки - завушніцы
Глаза - вочы
Отец - бацька
Расписание - расклад
Сапоги -боты
Дневник-дзённік
Гвоздь-цвік

**<u>Восьмае выпрабаванне “Грамацеі”</u>**

-Не сумняваюся ў тым, што члены каманды - граматныя вучні, і змогуць атрымаць “10” за слоўнікавы дыктант. Аднак наша дыктоўка незвычайная. Яна – камандная. Кожны член каманды піша толькі 1 слова і перадае лісток наступнаму свайму таварышу. Пачынае пісаць тэкст капітан, і ў канцы ў яго будзе 30 секунд, каб праверыць напісанае і здаць дыктант. Пачынаем.

*Настаўнік дыктуе:*

*Мова, вясна, хлеб, перапісчык, бацька, пісьменнік, вераб'і, воўк, акварыум, падарожжа,* возера, касьба, жолуд, футбол, паўночна-ўсходні, аддаляцца, дзень, завіруха.

- Мова - гэта не толькі набор слоў, але і мастацтва слова.

Зараз звернемся з вамі да твораў мастакоў слова. Ваша задача назваць аўтара і твор, радкі якога будуць зараз гучаць.

**Дзявятае выпрабаванне "Цытуем"**

Як мары, белыя бярозы,
Пад сінявой начной стаяць,

**У небе зоркі, ад марозу**
**Пахаладзеўшыя, дрыжаць.**

**Максім Багдановіч "Зімой"**

Падаюць сняжынкі--

дыяменты-росы,

**Падаюць бялюткі**

**за маім акном...**

**"Падаюць сняжынкі» Паўлюк Трус**

Здароў, марозны звонкі вечар!

Здароў, скрыпучы, мяккі снег!

**Мяцель не вее, сціхнуў вецер,**

**І волен лёгкіх санак бег**

**"Зімой", М.Багдановіч.**

Каб любіць Беларусь нашу мілую,
Трэба ў розных краях пабываць.
**Разумею цяпер, чаму з выраю**
**Жураўлі на Палессе ляцяць.**

**"Жураўлі на Палессе ляцяць" Алесь Ставер**

**Падвядзенне вынікаў. Узнагароджанне каманд.**

**Заключнае слова настаўніка**

-Хацелася б верыць, што сённяшняе мерапрыемства прынесла карысць, што весела правялі час разам. Я спадзяюся, што вандроўка ў краіну роднай мовы вамі будзе працягвацца.

Словы настаўніка на развітанне:

Жадаю вам, дзеці, і далей лагодна
Мовай народа валодаць свабодна.
І ў жыцці каб было вам лягчэй,
Мову сваю вывучайце хутчэй.

***ДАДАТАК***

***Выпрабаванне загадкамі (для гледачоў)***

Уночы ціхенька бурчыць,
А зранку пеўнем пракрычыць.
Каб не праспаў я, сочыць пільна
Надзейны сябра мой - … (Будзільнік)

Хоць не куст – лісткі скідае:
Дзень наступны адзначае.
Ліст апошні ападзе –
Новы год да нас ідзе. (Каляндар)

Будзе дождж – ды што за страх,
Я нясу з сабою дах!
Як пачую кропляў звон,
Раскрываю … (Парасон)

Пад шапкаю ды не грыб
На ножцы ды не расту.
А з малатком спаткаюся –
У дошку уміг схаваюся. (Цвік)

Кожны дзень са зброяй гэтай
Я палюю на катлеты.
З першай спробы ў іх пацэліць
Вастразубы мой … (Відэлец)

У кутку барада на кійку? (Венік)

Колькі нашае радні
Сабірае ён на дні:
Той – з відэльцам, гэты – з місай,
Ну а той – з вялікай лыжкай. (Стол)

Хто над намі дагары нагамі (Муха)

Кола рэжу напалам,
Кола мажу маслам сам,
І гатовы мой сняданак!
Што за кола? (Абаранак)

Каляровыя браткі
Носяць з дрэва кажушкі.
Мы завострым ім галоўкі,
Каб маглі пісаць … (Алоўкі)